УДК 343.9

А. Ф. ВІШНЕЎСКІ

# УЗДЗЕЯННЕ ТЭАРЭТЫЧНЫХ УСТАНОВАК А. Я. ВЫШЫНСКАГА НА САВЕЦКУЮ КРЫМІНАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ І ЮРЫДЫЧНУЮ ПРАКТЫКУ

*Аналізуецца ўплыў тэарэтычных палажэнняў А. Я. Вышынскага на фарміраванне савецкай крымінальнай палітыкі і іх уздзеянне на юрыдычную практыку ў 1930-х – пачатку 1950-х гадоў, яго роля ў парушэнні законнасці і абгрунтаванні пазапрацэсуальных метадаў расправы над савецкімі грамадзянамі. Удзяляецца ўвага характарыстыцы тэорыі прызнання абвінавачванага як рашаючага доказа па крымінальнай справе, прымяненне інстытута аналогіі ў крымінальным праве і інш.*



**ВІШНЕЎСКІ**
**Аляксей Фёдаравіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар права, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь

A. F. VISHNEVSKY

# THE IMPACT OF THEORETICAL POSITIONS OF A.YA. VYSHINSKY ON THE FORSOVIET CRIMINAL POLICY AND LEGAL PRACTICE

*The author analyzes the impact of theoretical positions of A.Ya. Vyshinsky on the formation of the Soviet criminal policy and their impact on the juridical practice in the 30's – early 50's of XX century. The article gives an estimate of A.Ya. Vyshinsky's role in the violation of legality and justification of extra-procedural methods for the massacre of the Soviet citizens. Attention is paid to the characteristics of the accused recognition theory as a decisive evidence in a criminal case, to the application of the institute of analogy in the criminal law, and others.*

**Уводзіны**

Канкрэтны гісторыка-прававы матэрыял сведчыць аб тым, што тэарэтычныя ўстаноўкі пракурора СССР А. Я. Вышынскага і практыка іх рэалізацыі садзейнічалі не толькі парушэнню законнасці і ўзмацненню рэпрэсій у краіне, але і стрымлівалі распрацоўку актуальных праблем юрыдычнай навукі.

«Памятаю: трывожна і прыемна ёкнула сэрца, калі ўнізе паказалася яго высакародная сівізна... Уся савецкая юрыспрудэнцыя расцягнулася ўздоўж лесвіцы, утвараючы шырокі праход. Госць бадзёра (папка пад пахай) адольваў прыступка за прыступкай і – трэба ж – раптоўна спыніўся. Сёння зноў не магу. І заўтра, сказаў ён некаму... Бачыў толькі яго, ён стаяў за два крокі ад мяне: нізкага росту, каржакаваты. Прыемны пах... Шчотачка тонкіх вусаў. Акуляры ў прыгожай аправе. За шклом – учэпісты, калючы, пранізлівы позірк. Крыху прыжмураныя вочы – таксама стальныя. Мінута, не больш, запомнілася на ўсё жыццё» [1, с. 13]. Такой у памяці студэнта юрыдычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, пазней вядомага савецкага пісьменніка Аркадзя Ваксберга засталася сустрэча з Андрэем Януар'евічам Вышынскім.

Зусім іншае захавала памяць тых, чые справы разглядаліся на судовых працэсах аб так званай палітычнай апазіцыі ў 1936–1938 гг. Вось некаторыя вытрымкі, узятыя з іх і іншых дакументаў, агучаных Вышынскім: «Законы патрэбна адкласці ў бок...», «Прытрымлівацца працэсуальных норм і папярэднія санкцыі на арышт не патрабуюцца...», «Дапытваць буду я сам, а вы будзеце фіксіраваць...», «Уся наша краіна, ад малога да старога, чакае і патрабуе аднаго: здраднікаў і шпіёнаў, прадаўшых ворагу нашу Радзіму, расстраляць як паганых сабак! ... раздавіце праклятую гадзіну!...», «...Ашалелых сабак я патрабую растраляць – усіх да аднаго» [2, с. 303, 423, 483, 562; 3, с. 229].

Апраўдваючы самавольства і беззаконнасць, якія мелі месца ў канцы 1920-х – пачатку 1950-х гадоў Вышынскі сцвярджаў, што рэвалюцыйная законнасць не выключае неабходнасці адступлення ў пэўных межах ад літары закона, у асаблівасці калі ён устарэў і перастаў адпавядаць патрэбнасцям перабудовы грамадства. «Трэба памятаць указанне т. Сталіна, – гаварыў Вышынскі на сходзе партактыву Пракуратуры СССР у сакавіку 1937 г., – што бываюць такія перыяды, такія моманты ў жыцці грамадства і ў жыцці нашым у прыватнасці, калі законы аказваюцца ўстарэлымі і іх патрэбна адкласці ўбок» [4, с. 118]. Такі падыход да закона знаходзім і ў працах Вышынскага пазнейшага перыяду. Так, у манаграфіі «Тэорыя судовых доказаў у савецкім праве» ён пісаў: «Фармальныя патрабаванні закона могуць уступіць у супярэчнасць з патрабаваннямі жыцця, з жывымі інтарэсамі грамадства і асобнага чалавека» [5, с. 184–185].

Такім чынам, замест тлумачэння неабходнасці ў пэўных выпадках ставіць пытанне аб замене ўстарэлага закона новым ён прама заклікаў адкінуць закон убок і дзейнічаць насуперак яму. У яго выказваннях, падкрэслівае вядомы юрыст М. В. Жогін, настойліва праводзілася адна думка: «можна праводзіць надзвычайныя мерапрыемствы, можна... дзейнічаць у абыход закона, па-за законам» [6, с. 23].

**Асноўная частка**

Андрэй Вышынскі насаджаў і спрабаваў тэарэтычна апраўдаць пазапрацэсуальныя метады расправы над савецкімі грамадзянамі. Пры яго непасрэдным удзеле дзейнічаў такі орган пазасудовай расправы, як Асобая нарада НКУС, рэспубліканскімі і абласнымі падраздзяленнямі наркамата арганізоўваліся «тройкі» і «двойкі». У Асобую нараду накіроўваліся, як правіла, тыя справы, па якіх не было сабрана доказаў, дастатковых для аддання абвінавачванага пад суд. Звычайны працэсуальны парадак разгляду крымінальных спраў, пры якім абвінавачванаму даецца права на абарону, у Асобай нарадзе адсутнічаў, справы разглядаліся завочна. У дадатак да гэтага 27 снежня 1937 г. пракуроры на месцах атрымалі ад А. Вышынскага загад, які прадпісваў выкарыстоўваць «тройкі» замест судоў, «калі доказы віны не дазваляюць іх выкарыстаць у час суда» [7, с. 107]. Такім чынам, асоба, якая прыцягвалася да адказнасці, была пазбаўленая магчымасці абараняцца ад абвінавачвання. Гэтым не толькі парушаліся правы і законныя інтарэсы абвінавачванага і іншых удзельнікаў працэса, але і ствараліся ўмовы для наўмыснага вынясення неабгрунтаваных прыгавораў з жорсткімі мерамі пакарання. Але гэта зусім не хвалявала А. Вышынскага. Напрыклад, калі 25 сакавіка 1936 г. Г. Г. Ягода ў лісце да Сталіна паведаміў аб узмацненні контррэвалюцыйнай дзейнасці трацкістаў і прапанаваў формы барацьбы з імі, то той ліст, па ўказанні «правадыра» быў накіраваны на разгляд А. Я. Вышынскаму. Апошні 31 сакавіка 1936 г. адказаў наступнае: «Лічу, што тав. Ягода… правільна і своечасова паставіў пытанне аб рашучым разгроме трацкісцкіх кадраў. Са свайго боку лічу неабходным усіх трацкістаў, якія знаходзяцца ў ссылцы і вядуць актыўную работу, адправіць у дальнія лагеры пастановай Асобай нарады пры НКУС, пасля разгледжання кожнай канкрэтнай справы. У тым жа парадку лічу неабходным адправіць у лагеры і трацкістаў, выключаных з УКП (б) пры апошняй праверцы партыйных дакументаў.

З майго боку таксама няма пярэчання супраць перадачы спраў аб трацкістах, якія маюць дачыненне да падрыхтоўкі тэрарыстычных актаў у ваенную калегію Вярхоўнага суда Саюза з прымяненнем да іх закона ад 1 снежня 1934 г. і вышэйшай меры пакарання – растрэлу…» [8, с. 35].

Вышынскі не раз заяўляў, што калі ставіць пытанне аб знішчэнні ворага, то і без суда яго можна знішчыць. Гэта быў прамы заклік да ўчынення пазасудовай расправы. «Не толькі суд і судовы прыгавор, – пісаў ён, – але і адміністрацыйныя меры ўздзеяння праз такія органы, як Асобая нарада пры НКУС … з'яўляюцца ў руках савецкай улады магутнай зброяй у барацьбе з ворагамі» [9, с. 82].

Гэтыя погляды А. Вышынскага знайшлі непасрэднае праяўленне і ў яго адносінах да працэсуальных гарантый. У прыватнасці, ён актыўна падтрымліваў ідэю максімальнага спрашчэння Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, звужэння працэсуальных гарантый. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны праект КПК. «У адрозненне ад раней дзеючага КПК, – падкрэсліваў ён, – мы сталі на шлях спробы крайняга сціскання гэтага КПК, звядзення яго да самага асноўнага, калі хочаце мінімальна неабходнага… У выніку новы праект замест ранейшых 465 артыкулаў утрымлівае толькі 167 артыкулаў» [10, с. 49]. Гэта была спроба значна скараціць працэсуальную рэгламентацыю пракурорска-следчай і судовай дзейнасці па крымінальных справах, выключыць з Кодэкса шэраг важных працэсуальных правілаў, што забяспечвалі гарантыі абгрунтаванасці судовых прыгавораў, правоў удзельнікаў працэса, і рэзка павялічыць сферу суб'ектыўнага меркавання асоб і органаў, якія вялі працэс. Дадзены праект КПК не быў прыняты, але ён наглядна сведчыў аб адносінах А. Вышынскага да законнасці, да гарантый правоў абвінавачваных у працэсе.

Вышынскі актыўна адстойваў думку пра тое, што дзейнасць следчага наогул не павінна быць рэгламентавана крымінальна-працэсуальным законам, што яна павінна ператварыцца ў разнавіднасць аператыўна-вышуковай працы. Ён сцвярджаў, што следчыя і вышуковыя органы з'яўляюцца звёнамі аднаго ланцуга следча-вышуковага апарату, тым самым Вышынскі імкнуўся пазбавіць папярэдняе следства працэсуальнай формы і звесці на нішто працэсуальныя гарантыі дасягнення ісціны і захавання правоў грамадзян у гэтай важнай стадыі працэсу [11, с. 327–328].

У працах і выступленнях А. Вышынскага ўтрымліваюцца грубыя тэарэтычныя памылкі і практычна шкодныя рэкамендацыі па многіх праблемах крымінальна-працэсуальнай дзейнасці. Напрыклад, ён неаднаразова сцвярджаў, што ў крымінальным працэсе дастаткова верагоднасці вывадаў аб вінаватасці. «Умовы судовай дзейнасці, – зазначаў ён, ставяць суддзю ў неабходнасць вырашаць пытанне не з пункту гледжання ўстанаўлення абсалютнай ісціны, а з пункту гледжання ўстанаўлення максімальнай верагоднасці тых ці іншых фактаў, падлягаючых судовай ацэнцы» [12, с. 20] .

Навучаючы пракурораў «мастацтву распазнавання шкоднікаў», А. Вышынскі сцвярджаў, што гэта дасягаецца не шляхам усебаковай, поўнай, аб'ектыўнай ацэнкі сабраных па крымінальнай справе доказаў, а так званым палітычным нюхам. Гэтыя сцвярджэнні стварылі аснову для вынясення неправасудных прыгавораў, абвяшчаўшых ісцінай тое, што было толькі больш-менш верагодным.

Пазней А. Вышынскі ўнёс карэктывы ў сваю канцэпцыю, аднак ён не крытыкаваў ранейшую пазіцыю: «Я абараняў пазіцыю, якая адмаўляла мэтазгоднасць і магчымасць прад'яўляць суду патрабаванне ўстанаўлення абсалютнай ісціны, таму што "ўмовы судовай дзейнасці ставяць суддзю ў неабходнасць вырашаць пытанне не з пункту гледжання ўстанаўлення абсалютнай ісціны, а з пункту гледжання ўстанаўлення максімальнай верагоднасці (правільней было б сказаць: з пункту гледжання верагоднасці. – *А. В.*) тых ці іншых фактаў, якія падлягаюць судовай ацэнцы. Я і зараз прытрымліваюся гэтага ж пункту гледжання. Патрабаваць ад суда, каб яго рашэнне было ўвасабленнем абсалютнай ісціны, яўна невыканальная ва ўмовах судовай дзейнасці задача» [5, с. 201]. Канцэпцыя «верагоднай ісціны» А. Я. Вышынскага магла з'явіцца толькі ва ўмовах найгрубейшых парушэнняў законнасці, масавых рэпрэсій у адносінах да савецкіх грамадзян.

Поўната, аб'ектыўнасць, усебаковасць расследавання і судовага разбору складаюць адзін з найважнейшых

прынцыпыў крымінальнага працэсу. Замацаваны ў заканадаўстве, гэты прынцып патрабуе прыняцця ўсіх прадугледжаных законам мер для выяўлення доказаў, якія як абвінавачваюць, так і апраўдваюць асобу, з тым каб выключыць усялякую магчымасць іншага тлумачэння ўстаноўленых судом падзей. А. Вышынскі сцвярджаў, што «па цэламу шэрагу спраў на папярэднім следстве можна абысціся без скрупулёзнай дэталёвай прапрацоўкі асобных пытанняў» і ў той жа час заклікаў да спрашчэння парадку разгляду спраў у судах, заяўляючы, што «без асаблівай патрэбы нечага паўтараць тое, што было ўстаноўлена на папярэднім следстве». Гэтыя разважанні ўспрымаліся некаторымі практычнымі работнікамі следства і суда як прамы заклік да спрашчэнства, вялі да зніжэння якасці следства і судовага разбору і да вынясення неабгрунтаваных і незаконных прыгавораў.

У далейшым Вышынскі пачаў развіваць думку, згодна з якой найбольш каштоўным, важным і рашаючым доказам па крымінальнай справе з'яўляюцца не рэчавыя і пісьмовыя доказы, а прызнанне абвінавачванага. Па справах аб дзяржаўных злачынствах, пісаў ён, «тлумачэнні абвінавачваных непазбежна набываюць характар і значэнне асноўных доказаў» [5, с. 264]. Як бачым, гэтую канцэпцыю А. Вышынскі пашыраў галоўным чынам на справы аб так званых контррэвалюцыйных злачынствах. І гэта зразумела, бо па гэтых справах вельмі часта дапускаліся найгрубейшыя парушэнні законнасці, з прычыны чаго з дапамогай незаконных метадаў вядзення допыту ўдавалася атрымліваць прызнанне абвінавачванага ў тым, чаго ён не ўчыняў. Разам з тым Вышынскі сцвярджаў: «Я асабіста лічу за лепшае мець паўпрызнанне, запісанае ўласнаручна абвінавачваным, чым поўнае прызнанне, запісанае следчым». Таму ён рэкамендаваў пракурорам і следчым практыкаваць запіс паказанняў уласнаручна абвінавачваным, каб ствараўся выгляд «добраахвотнасці» дачы гэтых паказанняў. А калі мець на ўвазе, што ў следчай рабоце ў разглядаемы перыяд дапускаліся грубыя парушэнні парадку допыту абвінавачваных, то апошнія нярэдка згаджаліся ўласнаручна запісаць свае «прызнанні», а затым у судзе ці ў Асобай нарадзе яны расцэньваліся як самы лепшы доказ [3, с. 234].

Пачынаючы з першых артыкулаў і падручнікаў па судаўладкаванню і крымінальнаму працэсу і заканчваючы аб'ёмнай кнігай «Тэорыя судовых доказаў у савецкім праве», Вышынскі старанна даказваў магчымасць прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці без устанаўлення яе вінаватасці, дапускаючы магчымасць прымянення мер крымінальнага пакарання па аналогіі. Таму не выпадкова ў лютым 1953 г. на навуковай сесіі Інстытута права АН СССР ён выступіў з рэзкай адмоўнай характарыстыкай падручніка «Агульная частка савецкага крымінальнага права» [13] за тое, што яго аўтары «не падвяргаюць крытыцы пазіцыю праціўнікаў аналогіі, не абараняюць неабходнасць інстытута аналогіі ў крымінальным праве» [14, с.24].

Абгрунтаванне Вышынскім права суда прымяніць пакаранне за дзеянне, якое прама не прадугледжана законам, а на падставе аналогіі разбурала важнейшы дэмакратычны прынцып крымінальнага права: «Няма злачынства, няма пакарання, без указання на тое ў законе». Грубаму парушэнню прынцыпаў крымінальнай адказнасці садзейнічала падтрымка Вышынскім аб'ектыўнага «вменения» – прымянення пакарання пры адсутнасці віны.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што тэарэтычныя ўстаноўкі Вышынскага служылі не справе замацавання ў жыцці прынцыпаў права, законнасці і справядлівасці, а, наадварот, абгрунтаванню і апраўданню масавага самавольства і беззаконня, грубых парушэнняў правоў і свабод чалавека. Сталін, які адмоўна ставіўся да права ў цэлым, правоў і свабод асобы ў прыватнасці, змог умела выкарыстаць асабістыя якасці Вышынскага (высокую эрудыцыю, хітрасць, вераломства, жах перад магчымай адказнасцю за меншавіцкае мінулае) для ажыццяўлення сваіх палітычных намераў. Ён разумеў, што ніхто іншы не змог бы так лоўка парушаць законнасць і правасуддзе ад імя закона, як гэта рабіў Вышынскі.

Стаўшы лідэрам юрыдычнага фронту, Вышынскі цалкам прыбраў у свае рукі распрацоўку актуальных праблем прававой навукі. Да апошняга дня свайго жыцця ён знаходзіўся па-за крытыкай, а сам не шкадаваў сілаў для расправы са сваімі праціўнікамі.

Магчымасць прымянення мер крымінальнага пакарання па аналогіі, прапановы аб «спрошчванні» крымінальнага працэсу, прызнанне тэорыі «небяспечнага стану асобы», у адпаведнасці з якой падставай для крымінальнай адказнасці павінна быць не канкрэтная віна, а небяспечны стан асобы, які вызначаецца, напрыклад яе сацыяльным паходжаннем, масавыя рэпрэсіі спрыялі росту нігілістычных адносін да права, законнасці. Невыпадкова большасць дэлегатаў XV з'езда партыі ледзь не высмеяла спробы М. Крыленкі даказаць неабходнасць для пракуратуры кіравацца законам, а не адвольна тлумачальнай мэтазгоднасцю [15, с. 15].

Лінія А. Я. Вышынскага на парушэнне законнасці, пашырэнне і ўзмацненне рэпрэсій выявілася і ў яго практычных указаннях. У прыватнасці, ім быў выдадзены шэраг загадаў і цыркуляраў, у якіх пракурорам і следчым давалася ўласнае тлумачэнне нормаў крымінальнага права, якое супярэчыла іх унутранаму сэнсу і неабгрунтавана пашырала падставы крымінальнай адказнасці [3, с. 291–292; 7, с. 107; 16, с. 18–21]. А. Вышынскі заяўляў, што ў асабліва складаныя перыяды развіцця грамадства агульнакрымінальныя злачынствы ператвараюцца ў палітычныя. Таму ён прапанаваў перагледзець крымінальныя справы ў мэтах надання ім палітычнага характару. Так, наўмысныя падпалы маёмасці, якая належала дзяржаве, ці грамадскім арганізацыям, незалежна ад матываў і мэтаў, Вышынскі патрабаваў кваліфікаваць па арт. $58^9$ КК РСФСР (дыверсія). Вынікае, што па артыкулах аб дзяржаўных злачынствах павінны былі кваліфікавацца дзеянні, учыненыя без контррэвалюцыйных намераў (напрыклад, падпал па матывах непрыязных адносін, помсты і г. д.). Установка на наданне агульнакрымінальным справам палітычнага характару была накіравана на штучнае раздуванне спраў аб палітычных злачынствах. І гэта пры тым, што Вышынскі ведаў пра ўказанне Леніна (якога ён паўсюдна цытаваў) аб тым, што пракуратура абавязана сачыць

за ўстанаўленнем сапраўды аднолькавага разумення законнасці, за дакладным выкананнем законаў.

Лінія пракурора СССР, накіраваная на самавольства і беззаконнасць, яскрава выявілася і ў яго адносінах да разгляду скаргаў з боку грамадзян, неабгрунтавана прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, а таксама членаў іх сем'яў. На адной з нарад у 1938 г. ён гаварыў, што разгляд усіх паступаючых скаргаў – гэта пераліванне з пустога ў парожняе [6, с. 25]. Усё гэта стварала надзвычай спрыяльныя ўмовы для хуткага распаўсюджвання беззаконня на месцах.

Неабходна падкрэсліць, што некаторыя абвінавачваныя, у дачыненні якіх прымяняліся незаконныя метады вядзення следства, ужо на папярэднім следстве ці ў судзе настойвалі на тым, каб у пратаколах допытаў былі зафіксаваны іх заявы адносна дапушчаных парушэнняў так званай сацыялістычнай законнасці. Асобныя пракуроры, ажыццяўляючы нагляд за следствам, таксама патрабавалі, каб такія заявы фіксаваліся ў пратаколах допытаў абвінавачваных. Пра гэта стала вядома Л. Берыі і ён патрабаваў ад А. Вышынскага, каб пракуроры не настойвалі на фіксаванні заяў абвінавачваных аб незаконных метадах допытаў у саміх пратаколах допытаў. А. Вышынскі ў пісьме на імя Л. Берыі паслужліва паведаміў, што ім дадзена ўказанне не фіксаваць такіх заяў у пратаколах допытаў, а ў выпадах неабходнасці запісваць гэтыя акалічнасці ў асобных пратаколах, якія не прыкладаюцца да крымінальнай справы [17, с. 29].

Такім чынам, А. Вышынскі ліквідаваў усе перашкоды для прымянення на допытах незаконных метадаў следства і ўзяў пад сваю абарону парушальнікаў законнасці.

Канкрэтныя матэрыялы сведчаць, што і ў 1930-я гады былі пракурорскія і судовыя работнікі, якія рабілі спробы прыпыніць ці змякчыць рэпрэсіі і самавольства. У гэтых адносінах характэрна дырэктыўнае пісьмо былога старшыні Вярхоўнага суда СССР А. М. Вінакурава, у якім указвалася на неабходнасць «клапатлівых адносін да тых, хто прыцягваецца да судовай адказнасці, у сэнсе недапушчэння неабгрунтаванага прыцягнення да судовай адказнасці і неабгрунтаванага асуджэння». Далей у пісьме адзначалася: «Усе органы юстыцыі павінны ў найбліжэйшы час перабудавацца такім чынам, каб спыніць неабгрунтаванае прыцягненне і неабгрунтаванае прымяненне судовай рэпрэсіі і тым самым зберагчы людзей для патрэб сацыялістычнага будаўніцтва, зберагчы кадры». Пісьмо было апратэставана А. Вышынскім. У пратэсце сцвярджалася, што А. Вінакураў у адкрытым пісьме прывёў сакрэтныя звесткі, і аспрэчваліся дадзеныя аб неабгрунтаваным прыцягненні вялікай колькасці людзей да крымінальнай адказнасці. У выніку пратэста пісьмо А. Вінакурава было знята, а на месцах растлумачвалі яго палітычную памылковасць [18, с. 239].

Пракуроры з месцаў неаднаразова звярталі ўвагу А. Вышынскага на самавольства, якое панавала ў дзейнасці НКУС, і перш за ўсё Асобай нарады, але ён не толькі не прымаў мер для спынення парушэнняў законнасці, а, наадварот, разглядаў такія паведамленні пракурораў як «варожыя вылазкі». Так, былы памочнік галоўнага воднага пракурора Рамнёў 26 чэрвеня 1936 г. звярнуўся ў Пракуратуру СССР з дакладной запіскай, у якой ставіў пытанне аб неабходнасці ліквідавання недахопаў і парушэнняў законнасці ў дзейнасці Асобай нарады. У запісцы ўказвалася, што пракуроры давалі толькі вусныя заключэнні па справах, якія разглядаліся Асобай нарадай, а нярэдка справы праходзілі і без заключэнняў пракурораў; заключэнні даваліся наспех, без вывучэння крымінальных спраў; разбор крымінальнай справы, незалежна ад яе складанасці, адбываўся ў Асобай нарадзе занадта хутка. Аднак надзеі Рамнёва былі дарэмнымі, бо А. Вышынскі і не збіраўся ліквідоўваць гэтыя абуральныя парушэнні. Замест таго, каб адрэагаваць на паведамленні работнікаў Бранскай гарадской пракуратуры аб незаконных метадах расследавання, якія прымяняліся ў органах НКУС, А. Вышынскі распарадзіўся арыштаваць і прыцягнуць да крымінальнай адказнасці пракурора горада і следчага гарадской пракуратуры «за распаўсюджванне ілжывых, заганных чутак» [19, с. 33].

Кіруючыся ўказаннем І. Сталіна аб неабходнасці «адшукваць» і абясшкоджваць шпіёнаў і дыверсантаў ва ўсіх звёнах дзяржаўнага апарату, А. Вышынскі правёў масавую чыстку ў органах пракуратуры. З яго санкцыі былі арыштаваны і аб'яўлены «ворагамі народа», а ў далейшым загінулі многія выдатныя пракурорскія работнікі, якія імкнуліся ў той ці іншай форме аслабіць рэпрэсіі, спыніць беззаконнасць. У выніку такой «чысткі» кадраў у 90 % краёў і абласцей пракуроры былі звольнены, а многія з іх неабгрунтавана арыштаваны – яны сталі ахвярамі культу асобы. Сярод ахвяр самавольства быў і першы пракурор СССР І. А. Акулаў, які займаў гэты пост з 1933 па 1935 год [20, с. 221]. У пачатку 1938 г. Вышынскі заклікаў працягваць працу па ачыстцы органаў пракуратуры ад «трацкісцка-бухарынскіх здраднікаў, агентаў фашызму і наогул чужых нам, палітычна няўстойлівых… элементаў» [21, с. 3].

Пагарджанне працэсуальнай формай, грубае парушэнне законных інтарэсаў абвінавачванага ў працэсе знайшлі адлюстраванне і ў пазіцыі, занятай А. Вышынскім у сувязі з прыняццем надзвычайных законаў 1 снежня 1934 г. і 14 лістапада 1937 г., якімі ўводзіўся спрошчаны парадак судаводства па асобных катэгорыях крымінальных спраў аб так званых контррэвалюцыйных злачынствах [22, 23]. Гэтыя законы ліквідоўвалі галоснасць судовага разгляду, выключалі магчымасць абскарджання прыгавораў, забаранялі абвінавачваным хадайнічаць аб памілаванні і такім чынам зводзілі на нішто канстытуцыйнае права абвінавачванага на абарону, парушалі элементарныя гарантыі высвятлення ісціны.

Займаючы пасаду пракурора СССР, акадэмік А. Вышынскі адначасова ўзначальваў Інстытут права Акадэміі навук СССР. Ён не толькі асабіста ўдзельнічаў у раздзіманні рэпрэсій у краіне, але і тэарэтычна іх абгрунтоўваў у сваіх шматлікіх артыкулах і манаграфіях.

Як вядома, у галіне прававой навукі са спецыяльнымі працамі І. Сталін амаль не выступаў, пакінуўшы ролю «тэарэтычнага аракула», «тэарэтычнай дубінкі» А. Вышынскаму. Апошні быў «яго рупарам у пытаннях дзяржавы і права і доўгія гады выступаў у якасці галоўнага тэарэтыка ў гэтых пытаннях, імкнучыся прыстасаваць прававую навуку для апраўдання судовага самавольства

і парушэння законнасці» [24, с. 57]. Калі Вышынскі ва ўсіх сваіх працах і выступленнях празмерна ўхваляў І. Сталіна, то ў сваю чаргу, набліжаныя да Вышынскага правазнаўцы стваралі «культ асобы Вышынскага», яго самога абвясцілі юрыдычным богам [25, с. 6]. Так, прафесар М. С. Страговіч у рэцэнзіі на кнігу А. Вышынскага «Тэорыя судовых доказаў у савецкім праве» пісаў, што гэта праца «з'яўляецца каштоўным укладам у марксісцкую навуку ў цэлым, асвятляючы шэраг найважнейшых тэарэтычных пытанняў і служачы ўзорам прымянення марксісцкага дыялектычнага метаду да вывучэння права» [26, с. 80]. Але ж менавіта ў гэтай кнізе, адзначанай Сталінскай прэміяй і прызнанай у свой час класічнай працай, утрымліваюцца сцверджанні, якія сёння гучаць непраўдападобна, аднак іх засвоілі як юрыдычную біблію тысячы юрыстаў-практыкаў: «тлумачэнні абвінавачаных непазбежна набываюць характар і значэнне асноўных доказаў, важнейшых вырашаючых доказаў»; «прынцып спаборнасці бакоў, як і прынцып роўнасці, ў працэсе абвінавачання і абароны – буржуазная спадчына; старая формула «няхай загіне свет, але пераможа правасуддзе» – не больш чым юрыдычная схаластыка; лацінская формула – «закон суровы, але гэта закон», якая патрабуе дакладнага і усеагульнага яго выканання, «не дае месца гнуткасці ў справе прымянення закона».

**Заключэнне**

Да чаго прывяло абвяшчэнне А. Вышынскага адзіным бясспрэчным аўтарытэтам у галіне навукі права зараз вядома. Работнік Пракуратуры РСФСР, а ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. старшыня Вярхоўнага суда СССР А. А. Волін, які добра ведаў яго, пісаў: «...Адукаваны юрыст, чалавек гібкага розуму, прызнаны аратар, які сваёй трапнай прамовай мог захапіць аўдыторыю... Прымаючы ўдзел у пасяджэннях вучонага савета Інстытута права, ён ніколі не прызнаваў сваіх памылак. Карыстаючыся сваім службовым і навуковым становішчам, Вышынскі нярэдка зневажаў сваіх апанентаў, іх чалавечую годнасць і рабіў гэта з якімсьці задавальненнем... Ён стаў чалавекам Сталіна, адданым і вопытным выканаўцам яго жорскіх рэпрэсій» [16, с. 86] .

Калі раней з тэарэтычнымі поглядамі Вышынскага маглі палемізаваць, напрыклад М. Крыленка, ці выдатны вучоны, былы дырэктар Інстытута права Я. Пашуканіс, то ў далейшым (пасля знішчэння іх і іншых вучоных) у адкрытую тэарэтычную схватку з ім не ўступіў ніхто. Асабліва актыўнай (і найбольш шкоднай) стала тэарэтычная дзейнасць Вышынскага пасля разгрому так званай апазіцыі і палітычных працэсаў 1936–1938 гг., калі асноўныя «ворагі народа» былі адоленыя.

На думку А. Вышынскага, становішча на фронце прававой тэорыі ў 1930-я гг. было засмучальным. «Наўрад ці знойдзецца, – пісаў ён, – іншая такая адсталая, такая засмечаная ўсялякім ілжэмарксісцкім, антынавуковым гніллём і хламам галіна тэорыі, чым галіна права. Наўрад ці ў якой-небудзь іншай галіне так доўга і так бессаромна "мелі хаджэнне", ды і яшчэ зараз працягваюць мець хаджэнне "тэорыі" і "тэорыйкі", прасякнутыя атрутай найгрубейшых скажэнняў вучэння Маркса – Леніна – Сталіна аб дзяржаве і праве» [27, с. 5]. Таму, каб ачысціць навуку ад гэтага «гнілля і хламу» ён бязлітасна і знішчальна крытыкаваў прафесараў Гойхбарга, Рэйснера, Ільінскага, Магяроўскага, Разумоўскага, Архіпава і іншых, якія, па яго меркаванні, «перапявалі на савецкі лад буржуазныя тэорыі псіхалагістаў, нарматывістаў, усіх гэтых Петражыцкіх, Кнапаў, Дзюгі, Карнераў і інш.» Далей ён пісаў, што ў гэтай жа галіне арудаваў «двурушнік Пашуканіс», які «бескантрольна гаспадарыў у Інстытуце сацыялістычнага будаўніцтва і права». Крытыкаваў ён таксама погляды П. Стучкі [27, с. 5].

Член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР В. Чхіквадзе пазней пісаў наконт такіх выкрыццяў: «Стаўшы "лідэрам" юрыдычнага фронту, Вышынскі поўнасцю прыбраў да рук "распрацоўку" актуальных праблем прававой навукі. Да самага апошняга дня свайго жыцця ён знаходзіўся па-за крытыкай, а сам жа не шкадаваў намаганняў для расправы (фізічнай і маральнай) са сваімі праціўнікамі» [28, с. 65].

Такім чынам, вокрык на іншадумца, прычэпліванне яму ярлыкоў антымарксіста, а часам і прама шкодніка з наступным прымяненнем мер крымінальнай рэпрэсіі – вось што было характэрна для «навуковага кіраўніцтва А. Вышынскага». Нецярпімы тон яго крытыкі згубна ўплываў на развіццё юрыдычнай навукі, сур'ёзна стрымліваў далейшае развіццё прававой думкі, перашкаджаў росту маладых навуковых кадраў, садзейнічаў насаджэнню дагматычнага метаду мыслення.

Юрыдычныя часопісы не асмельваліся падчас прадстаўляць свае старонкі аўтарам, якія не падзялялі погляды А. Вышынскага. Таму варта пагадзіцца з прафесарам В. Радзьковым, які адзначаў, што «культ Вышынскага – гэта таксама рэжым у юрдычнай навуцы, які перашкаджаў развіццю новых ідэй» [29, с. 63] .

Такім чынам, аналіз канкрэтнага матэрыялу наглядна сведчыць пра значную шкоду, якую прычынілі канцэпцыі А. Вышынскага і яго практычная дзейнасць на пасадзе пракурора СССР савецкай прававой навуцы, справе ўмацавання законнасці і практыцы барацьбы са злачыннасцю. Погляды Вышынскага не заставаліся толькі яго «тэарэтычнымі» памылкамі. Ёнператвараў іх у дзеянні, накіраваныя на ўчыненне самавольства і беззаконнасці і іх апраўданне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Ваксберг, А. Царица доказательств : [о деятельности А. Я. Вышинского] / А. Ваксберг // Лит. газета. – 1988. – 27 янв. – С. 13.
2. Вышинский, А. Я. Судебные речи / А. Я. Вышинский. – Изд. 3-е. – М. : Госюриздат, 1953. – 564 с.
3. Кудрявцев, В. Политическая юстиция в СССР / В. Кудрявцев, А. Трусов. – М. : Наука, 2000. – 365 с.
4. Курицын, В. М. 1937 год в истории советского государства / В. М. Курицын // Советское государство и право. – 1988. – № 2. – С. 109–119.

5. Вышинский, А. Я. Теория судебных доказательств в советском праве / А. Я. Вышинский. – 3-е изд., доп. – М. : Госюриздат, 1950. – 308 с.
6. Жогин, Н. В. Об извращениях Вышинского в теории советского права и практике / Н. В. Жогин // Сов. государство и право. – 1965. – № 3. – С. 22–31.
7. Маслов, В. П. Сталинские репрессии и советская юстиция / В. П. Маслов, Н. Ф. Чистяков // Коммунист. – 1990. – № 10. – С. 102–112.
8. О так называемом «Параллельном антисоветском троцкистском центре» // Известия ЦК КПСС. – 1989. – № 9. – С. 30–50.
9. Вышинский, А. Я. Судоустройство в СССР : учеб. пособие / А. Я. Вышинский. – М. : Юрид. изд-во НКЮ СССР, 1940. – 344 с.
10. Вышинский, А. Я. Реформа уголовно-процессуального законодательства / А. Я. Вышинский // Сов. государство и право. – 1934. – № 6. – С. 44–51.
11. Теория доказательств в советском уголовном процессе / Р. С. Белкин [и др.] ; отв. ред. Н. В. Жогин. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрид. лит, 1973. – 736 с.
12. Вышинский, А. Я. Проблема оценки доказательств в советском уголовном процессе / А. Я. Вышинский // Проблемы уголовной политики.– М. : Юрид. изд. НКЮ СССР, 1937. – Кн. IV. – С. 13–38.
13. Общая часть советского уголовного права / М. А. Гельфер [и др. ] ; под ред. В. Чхиквадзе. – М. : Госюриздат, 1959. – 464 с.
14. Вышинский, А. Я. Некоторые вопросы науки советского права / А. Я. Вышинский // Сов. государство и право. – 1953. – № 4. – С. 10–26.
15. Вішнеўскі, А. Дыктатура і права : [пра дзейнасць А. Я. Вышынскага] // ЛіМ. – 1995. – 10 лют. – С. 14–15.
16. Приговоренные временем. Российские и советские прокуроры. XX век. 1937–1953 гг. / В. Б Алексеев [и др.]. – М. : РОССПЭН, 2001. – 536 с.
17. Вішнеўскі, А. Ф. Пракурор А. Я. Вышынскі ў святле ўмацавання таталітарнага палітыка-прававога рэжыму ў СССР / А. Ф. Вішнеўскі, А. А. Вішнеўскі // Вестн. Акад. МВД Респ. Беларусь. – 2005. – № 1. – С. 24–35.
18. Соломон, П. Советская юстиция при Сталине : пер. с англ. / П. Соломон. – М. : РОССПЭН, 1998. – 464 с.
19. Вішнеўскі, А. Ф. Да пытання аб скажэннях А. Я. Вышынскага ў тэорыі права і юрыдычнай практыцы / А. Ф. Вішнеўскі // Вестн. Акад. МВД Респ. Беларусь. – 2005. – № 2. – С. 32–38.
20. Звягинцев, А. Г. От первого прокурора России до последнего прокурора Союза / А. Г. Звягинцев, Ю. Г. Орлов. – М. : Олма–Пресс, 2001. – 383 с.
21. Вышинский, А. Я. Кадры / А. Я. Вышинский // Социалистическая законность. – 1938. – № 1. – С. 3–14.
22. СЗ СССР. – 1935. – № 64. – Ст. 459.
23. СЗ СССР. – 1937. – № 61. – Ст. 166.
24. Карев, Д. Ликвидировать последствия культа личности в советской правовой науке / Д. Карев // Социалистическая законность. – 1962. – № 2. – С. 56–62.
25. До конца ликвидировать вредные последствия культа личности в советской юриспруденции // Сов. государство и право. – 1962. – № 4. – С. 3–16.
26. Строгович, М. С. [Рецензия] / М. С. Строгович // Социалистическая законность. – 1941. – № 2. – С. 79–81. – Рец. на учебник : Вышинский, А. Я. Теория судебных доказательств в советском праве / А. Я. Вышинский. – М. : Юрид. изд-во НКЮ СССР, 1941. – 219 с.
27. Вышинский, А. Я. Положение на фронте правовой теории / А. Я. Вышинский // Социалистическая законность. – 1937. – № 5. – С. 3–11.
28. Чхиквадзе В. О вреде, причиненном А.Я. Вышинским развитию советской юридической науки / В. Чхиквадзе // Социалистическая законность. – 1989. – № 9. – С. 65–67.
29. Обсуждение в МГУ вопроса о преодолении последствий культа личности в юридической науке // Социалистическая законность. – 1962. – № 2. – С. 62–63.

22.06.2017